Источник: "Настаўніцкая газета" - 2017-12-30



# Малады прафесар

Наш пастаянны аўтар прафесар Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта *Міхаіл Стралец* падзяліўся прыемнай навіной: доктар геолага-мінералагічных навук, прафесар, загадчык кафедры геаграфіі і прыродакарыстання Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С.Пушкіна (БрДУ) **Максім Альбертавіч Багдасараў** быў выбраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Да гэтага Максім Альбертавіч быў вядомы тым, што ва ўзросце 35 гадоў абараніў доктарскую дысертацыю, а ў 39 гадоў атрымаў атэстат прафесара. Да яго ніхто з навукоўцаў Брэсцкай вобласці так рана не папаўняў доктарскі корпус і прафесарскую супольнасць.

Па словах аўтара, любоў да геаграфіі, геалогіі ў Максіма Альбертавіча выхаваў яго бацька, Альберт Аляксандравіч, выбітны навуковец-геолаг, які на працягу многіх гадоў выкладаў на факультэце прыродазнаўства БрДУ.

Навуковец і педагог Максім Альбертавіч Багдасараў пяты год з'яўляецца членам экспертнага савета Міністэрства адукацыі па навуковым напрамку "Экалогія, прыродныя рэсурсы, рэсурсазберажэнне, прыродакарыстанне і абарона ад надзвычайных сітуацый". Акрамя таго, М.А.Багдасараў — намеснік старшыні Брэсцкага абласнога аддзялення Беларускага геаграфічнага таварыства.

Наталля Кастэнка. Малады прафесар